УДК 021:908

*С. В. ЗЫГМАНТОВІЧ, В. І. САІТАВА*

# НАВУКОВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПА КРАЯЗНАЎСТВЕ ЯК УВАСАБЛЕННЕ КУЛЬТУРНАЙ МІСІІ БІБЛІЯТЭКІ

*Разглядаюцца аспекты навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве на сучасным этапе, раскрываюцца яе формы і змест, робіцца выснова аб інстытуцыялізацыі бібліятэк як рэгіянальных цэнтраў навуковых даследаванняў у галіне краязнаўства.*

Бібліятэкі, што вядуць краязнаўчую дзейнасць, садзейнічаюць захаванню, развіццю і перадачы культуры рэгіянальнай супольнасці, культурных каштоўнасцей, якія ўвасабляюць самабытнасць пэўных гістарычных перыядаў і пакаленняў. Значымасць гэтай дзейнасці дае падставы не толькі абгрунтоўваць краязнаўчую функцыю публічных бібліятэк [8], але і шукаць у сучасных умовах шляхі ажыццяўлення бібліятэкамі культурнай місіі.

Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства назапасіла вялікі вопыт культурна-камунікацыйнай (асветніцкай) і інфармацыйнай дзейнасці, заснаванай на дынамічна развіваемых краязнаўчых інфармацыйных рэсурсах. Гэтыя напрамкі дзейнасці запатрабаваны ў грамадстве, пра што сведчыць бібліятэчная практыка. Разам з тым усё выразней выяўляецца цікавасць бібліятэкараў-краязнаўцаў да даследаванняў свайго рэгіёна, распрацоўкі і ажыццяўлення асобных праектаў і стварэння арыгінальнай навуковай прадукцыі.

Накіраванасць на навукова-даследчую дзейнасць уласціва краязнаўству як грамадскай з’яве і яго ўдзельнікам як прафесійным, так і аматарам. У вызначэннях краязнаўства адлюстравана, што гэта дзейнасць па ўсебаковым вывучэнні рэгіёнаў/населеных пунктаў, якую ажыццяўляюць мяс-

цовае насельніцтва і спецыялісты навуковых устаноў. Тэрмін «краязнаўства» разглядаецца і як комплекс навуковых дысцыплін, аб'ектам вывучэння якога з'яўляюцца тэрыторыі ў межах краіны. У краязнаўстве выкарыстоўваюцца розныя навуковыя метады [9].

Тэндэнцыя развіцця навуковых даследаванняў выразна выяўляецца ў сучасным бібліятэчным краязнаўстве, што знаходзіць адлюстраванне ў нарматыўных дакументах бібліятэк. Асноўныя мэты і задачы навукова-даследчай дзейнасці публічных бібліятэк раскрыты ў падрыхтаваным РБА «Руководстве по краеведческой деятельности муниципальных публичных библиотек (централизованных библиотечных систем)» і аналагічным дакуменце для цэнтральных бібліятэк суб'ектаў Расійскай Федэрацыі (вобласці, краю) [6; 7]. У іх адзначана, што навукова-даследчая дзейнасць ЦБС звязана з практычнымі задачамі фарміравання краязнаўчых рэсурсаў і абслугоўвання чытачоў. Яна мае пераважна прыкладны характар і грунтуецца на выніках вывучэння інфармацыйнай забяспечанасці краязнаўчых аб'ектаў на сваёй тэрыторыі. Даследаванні, прысвечаныя краязнаўчым інфармацыйным рэсурсам, бясспрэчна, з'яўляюцца галоўнымі ў навукова-даследчай рабоце абласных і публічных (масавых) бібліятэк як у Расіі, так і ў Беларусі і нацэлены на ўдасканаленне практычнай краязнаўчай дзейнасці. Ажыццяўляюць такую работу і некаторыя спецыяльныя бібліятэкі (устаноў вышэйшай адукацыі і інш.). У нарматыўных дакументах бібліятэк адзначана, што краязнаўчыя даследаванні «ўносяць уклад у развіццё рэгіянальнай гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, краязнаўства, кнігазнаўства, бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і інш.» [5]. У Палажэнні аб краязнаўчай рабоце, напрыклад, Пскоўскай абласной універсальнай бібліятэкі, аднаго з лідараў сучаснага бібліятэчна-інфармацыйнага краязнаўства, сярод асноўных напрамкаў навукова-даследчай дзейнасці названа вывучэнне:

– спажыўцоў і патрэбнасцей у краязнаўчай інфармацыі;
– гісторыі і сучаснай практыкі (арганізацыі, тэхналогіі, методыкі і інш.) краязнаўчай дзейнасці;
– кніжных фондаў і калекцый краязнаўчых дакументаў і мясцовых выданняў [5].

Акрамя таго, вызначаны яшчэ адзін напрамак: гісторыка-краязнаўчыя даследаванні (гісторыя краязнаўчай дзейнасці ў рэгіёне, гісторыя бібліятэк і кніжнай справы ў рэгіёне). Раскрываючы гэты напрамак, у палажэнні заяўлена, што бібліятэка «ўдзельнічае ў краязнаўчых даследаваннях іншай праблематыкі: па гісторыі самога рэгіёна, яго асобных тэрыторый і населеных пунктаў, па рэгіянальнай біяграфіцы, генеалогіі і гісторыі сем'яў» [5].

Дзяржынская ЦРБ Мінскай вобласці ў ажыццяўляемай на працягу 2001–2015 гг. праграме «Мая зямля, мае землякі» вызначыла правядзенне пошукавай і даследчай работы ў мэтах стварэння новых крыніц краязнаўчай інфармацыі розных відаў, а таксама даследаванняў па зборы і захаванні мясцовага фальклору, сучасных гаворак і іншых напрамках [3]. Такім чынам, характар краязнаўчай дзейнасці, яе культурная і гуманістычная накіраванасць спрыяюць росту значнасці навуковага прафесіяналізму бібліятэчных спецыялістаў-краязнаўцаў. Менавіта яны, працуючы з фіксаванымі крыніцамі інфармацыі ці жывымі сведкамі падзей, вядуць кумуля-

ванне ведаў аб рэгіёне, выпраўляюць недакладнасці ў фактаграфіі, выяўляюць невядомыя старонкі мінуўшчыны.

Бібліятэчныя спецыялісты-краязнаўцы заяўляюць сябе як даследчыкі шырокага кола тэм гісторыі і сучаснасці рэгіёнаў і населеных пунктаў, пра што сведчаць іх публікацыі і даклады, навукова-кансультацыйная дзейнасць, а таксама ўклад бібліятэк у арганізацыю і правядзенне буйных навуковых мерапрыемстваў: праграм даследаванняў, навуковых канферэнцый па краязнаўстве. Напрыклад, супрацоўнікі цэнтра краязнаўства Барысаўскай ЦРБ імя І. Х. Каладзеева А. А. Балябін, І. А. Карпава, Л. Л. Ціхановіч з'яўляюцца распрацоўшчыкамі інавацыйных навуковых праектаў і аўтарамі шматлікіх навуковых публікацый, якія раскрываюць новыя старонкі гістарычнага мінулага Барысаўшчыны [2].

У працэсе навуковай дзейнасці па краязнаўстве мэтанакіравана і паслядоўна выкарыстоўваюцца пошукавыя і пазнавальныя мерапрыемствы, якія дазваляюць выяўляць і даваць поўную характарыстыку прадметам пошуку: фактам, з'явам, падзеям, асобам і інш.

Спецыфіка краязнаўчай дзейнасці бібліятэк у тым, што фактамі, на якія накіраваны пошук і пазнавальныя працэдуры, як правіла, з'яўляюцца фіксаваныя крыніцы інфармацыі. Ужыванне кнігазнаўчых і бібліяграфічных метадаў пазнання дакументаў (тэкстаў) – шлях стварэння гісторыка-кніжных і бібліяграфічных ведаў. Яны ўвасабляюцца ў калекцыях краязнаўчых і мясцовых дакументаў, у краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсах, у распрацоўцы метадычных рашэнняў адносна работы з фіксаванымі крыніцамі інфармацыі. Гэты арганічны кампанент пошукава-даследчай практычнай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве абумоўлены як уваходжаннем навуковых ведаў у практычную дзейнасць, так і сутнасцю краязнаўства. Таму ў бібліятэчнай практыцы Беларусі мноства прыкладаў: краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Ф. Карскага, Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна, Барысаўскай, Дзяржынскай, Нясвіжскай ЦБС, ЦГБ г. Жодзіна і інш.

У той жа час у дзейнасці бібліятэкараў па краязнаўстве пашыраецца тэндэнцыя выкарыстання метадаў гістарычных даследаванняў: гісторыка-генетычнага, ідэаграфічнага і іншых, з дапамогай якіх раскрываюцца з найбольшай паўнатой і дакладнасцю падзеі мінулага, «белыя плямы» мясцовай гісторыі. Вынікі гэтага кірунку пошукава-даследчай дзейнасці ўвасабляюцца ў рознай навуковай прадукцыі: артыкулах, дакладах, навуковых кансультацыях і інш. Знакавай падзеяй пошукава-даследчай дзейнасці, што характарызуе гэтую тэндэнцыю, з'явілася стварэнне сельскімі бібліятэкамі Беларусі пад кіраўніцтвам метадычных цэнтраў летапісаў вёсак – унікальных крыніц рэгіянальнай памяці. Выключна важнымі становяцца навуковыя праекты генеалагічнага характару і вывучэння мясцовай тапаніміі, у рэалізацыі якіх паспяхова працуе ЦГБ г. Жодзіна. Наперадзе ў бібліятэк і папаўненне нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў фактаграфічнымі ведамі краязнаўчага характару, працэс, які грунтуецца і на выніках навуковых пошукаў. У практыцы нярэдка адбываецца цесная сувязь даследчых і навукова-метадычных функцый абласных бібліятэк, асабліва ў дзейнасці па стварэнні краязнаўчых інфармацыйных рэсур-

саў, распаўсюджванні краязнаўчых ведаў. Даследчыя праекты краязнаўчага характару ўключаюцца ў планы дзейнасці краязнаўчых аддзелаў, сектараў і цэнтраў бібліятэк, аддзелаў маркетынгу, бібліятэказнаўства і інш.

Ёсць усе падставы лічыць, што даследаванні бібліятэк па краязнаўстве тэрытарыяльна лакалізаваны, аднак недастаткова вывучаюцца і абагульняюцца на рэспубліканскім узроўні. Такую працу мэтазгодна ажыццявіць і абласным бібліятэкам і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі як навукова-метадычным і каардынацыйным цэнтрам бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. Канстатуючы, з аднаго боку, цікавасць да краязнаўчых даследаванняў, з другога – пэўную стыхійнасць самой даследчай дзейнасці, мы звязваем нявызначанасць становішча з адсутнасцю ў абласных бібліятэк статусу навуковых устаноў. У Беларусі (як і ў Расіі) у адпаведнасці з існуючай справаздачнасцю – форма 1-Бібліятэка (Мінкультуры) – не адлюстроўваецца навукова-даследчая работа як самастойны від дзейнасці, і няма непасрэднай залежнасці паміж яе правядзеннем і фінансаваннем бібліятэк [1]. Тым не менш даследаванні па краязнаўстве на сучасным этапе могуць разглядацца ў ліку прыярытэтных напрамкаў навукова-даследчай дзейнасці бібліятэк, перш за ўсё абласных. Іх мэтамі з'яўляюцца ўдасканаленне практычнай краязнаўчай дзейнасці бібліятэк, папаўненне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў рэгіёна, вывучэнне магчымасцей інтэлектуальнага доступу да іх, нарошчванне ведаў аб крыніцах краязнаўчай інфармацыі. У сукупнасці дасягненне гэтых мэт спрыяе развіццю бібліяграфічнай і фактаграфічнай асновы ўсіх іншых форм і відаў краязнаўчай дзейнасці. Новае ў іх здзяйсненні выяўляецца ў распрацоўцы і рэалізацыі інавацыйных краязнаўчых праектаў.

Адметным кірункам навуковай працы стаў удзел бібліятэкараў-краязнаўцаў у даследаванні гістарычных, літаратурных, моўных і іншых, пераважна гуманітарных, пытанняў развіцця рэгіянальнай супольнасці. Яго мэтамі з'яўляецца прырашчэнне ведаў і ўяўленняў аб мясцовай гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі, сямейна-родавай гісторыі і іншых галінах і тэмах.

Разам гэтыя напрамкі раскрываюць сучасную навуковую работу бібліятэк па краязнаўстве як складаную па мэтах і змесце з'яву, адкрытую для ўзаемадзеяння з іншымі суб'ектамі ў галіне краязнаўчых даследаванняў, якая ўзбагачае грамадства новымі рэгіёназнаўчымі ведамі – каштоўнай асновай разгортвання культурна-камунікацыйнай дзейнасці бібліятэкі.

Асаблівая роля ў навукова-даследчай рабоце належыць абласным бібліятэкам, якія праводзяць краязнаўчыя даследаванні самастойна, арганізуюць іх у цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах, удзельнічаюць у даследчых праектах іншых устаноў і арганізацый. У апошнія дзесяцігоддзі абласныя бібліятэкі выступаюць як арганізатары буйных даследчых праектаў, аб'ядноўваюць іншых удзельнікаў навуковай дзейнасці па краязнаўстве. У гэтых выпадках абласная бібліятэка выступае галоўным распрацоўшчыкам даследчага праекта, каардынуе ўзаемадзеянне сярод удзельнікаў даследавання, апрацоўвае вынікі, ажыццяўляе іх публікацыю.

Сярод такіх праектаў вядучымі з'яўляюцца міжнародныя і рэспубліканскія навукова-практычныя канферэнцыі і чытанні, рэгіянальныя і міжнародныя праекты, праграмы, падрыхтоўка навуковых выданняў.

Бібліятэкі выступаюць ініцыятарамі і арганізатарамі правядзення навуковых краязнаўчых канферэнцый і чытанняў, пры падрыхтоўцы якіх узаемадзейнічаюць з краязнаўчымі музеямі, універсітэтамі, сярэднімі школамі, інстытутамі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з мясцовымі органамі ўлады і кіравання культурай, замежнымі даследчыцкімі цэнтрамі і інш.

На канферэнцыях аналізуюцца дасягненні па фарміраванні фондаў краязнаўчых дакументаў, пытаннях удасканалення краязнаўчага даведачна-бібліяграфічнага апарату, дзейнасці па папулярызацыі культурнай спадчыны і дасягненняў эканамічнага развіцця, выпрацоўваюцца перспектыўныя напрамкі бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства. У Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласных бібліятэках правядзенне навуковых канферэнцый па краязнаўчай праблематыцы стала традыцыйнай формай НДР. Так, Гомельская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна шмат гадоў займаецца вывучэннем спадчыны М. П. Румянцава, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Расійскай імперыі, чыё жыццё і дзейнасць былі звязаны з Гомелем, з'яўляецца адным з арганізатараў «Румянцаўскіх чытанняў». Фундаментальнасцю тэматыкі характарызуюцца канферэнцыі Брэсцкай і Гродзенскай абласных бібліятэк. Напрыклад, у Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (2008, 2012) прымалі ўдзел даследчыкі Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны з дакладамі па гісторыі кніжнай культуры краю, аб лёсе мясцовых бібліятэк і архіваў, рэдкіх і малавядомых бібліяграфічных крыніцах, прысвечаных Брэстчыне. Гродзенская абласная бібліятэка імя Я. Ф. Карскага праводзіць навукова-практычныя канферэнцыі пад назвай «Гарадзенскія краязнаўчыя чытанні», прысвечаныя выдатным падзеям і дзеячам у гісторыі краю: да 230-годдзя «Газеты Гродзенскай», 880-годдзю Гродна, 240-годдзю Гродзенскага тэатра Тызенгаўза, 660-годдзю Вітаўта, князя Гарадзенскага, Трокскага і Вялікага князя Літоўскага, 170-годдзю з дня нараджэння Элізы Ажэшкі і інш. У 2012 г. бібліятэка адкрыла новы навуковы праект «Шчорсаўскія чытанні», звязаныя з імем І. Л. Храптовіча, знакамітага земляка, дзяржаўнага і культурнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага.

Падобныя пачынанні распаўсюджваюцца і сярод цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм. Уражвае навуковае прадстаўніцтва на Міжнародных навукова-практычных канферэнцыях «Каладзееўскія чытанні», якія праводзіць Барысаўская ЦРБ, дзе выступаюць не толькі беларускія даследчыкі, але і навукоўцы з Францыі і Расіі. Навагрудская ЦРБ выступіла ў якасці партнёра Гродзенскай абласной бібліятэкі пры правядзенні «Першых Шчорсаўскіх чытанняў». Лідская ЦРБ імя Я. Купалы ў 2013 г. правяла Першыя Лідскія чытанні, прысвечаныя 150-годдзю паўстання 1863–1864 гг.

Рэгіянальныя і міжнародныя праграмы і праекты, такія як «Жывая памяць Гомельшчыны», «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю. І. Крашэўскага» і іншыя з'яўляюцца не толькі буйным укладам у фарміраванне рэгіянальнага кампанента нацыянальнай інфармацыйнай прасторы, але і вылучаюцца складанымі пошукава-даследчымі вынікамі. У ходзе іх рэалізацыі адбываецца абмен метадамі, вопытам даследчай дзейнасці па галінах краязнаўства: бібліятэчна-бібліяграфічнага, гісторыка-кніжнага, гістарычнага, этнаграфічнага, геаграфічнага і інш.

Усе буйныя формы навуковай работы па краязнаўстве ажыццяўляюцца як дзякуючы актыўнаму ўзаемадзеянню бібліятэк, так і супрацоўніцтву з іншымі навуковымі цэнтрамі, навучальнымі ўстановамі, органамі адміністрацыйнага кіравання. Пры гэтым плённае супрацоўніцтва нярэдка выходзіць не толькі за межы рэгіёнаў і краіны, але і ахоплівае замежных удзельнікаў. Так, у праекце «Віртуальная рэканструкцыя спадчыны Ю. І. Крашэўскага» разам з Брэсцкай абласной бібліятэкай удзельнічаюць Нацыянальная бібліятэка Беларусі, бібліятэкі і музеі Украіны і Польшчы. Плануецца падаць у лічбавай форме багатую літаратурную спадчыну знакамітага ўраджэнца Брэсцкага краю і стварыць інтэграваны бібліяграфічны рэсурс для арыентацыі ў дакументальным масіве, звязаным з яго імем. Усё гэта дасць магчымасць актуалізаваць імя Ю. Крашэўскага ў навуковым, адукацыйным і асветніцкім аспектах, забяспечыць даступнасць створаных рэсурсаў для шырокага кола карыстальнікаў.

Лагічна, што вынікі навуковых даследаванняў бібліятэк знаходзяць адлюстраванне ў публікацыях, буйнейшымі сярод якіх з'яўляюцца зборнікі матэрыялаў навуковых канферэнцый. Так, Магілёўская абласная бібліятэка сумесна з абласным краязнаўчым музеем, Магілёўскім дзяржаўным універсітэтам імя А. А. Куляшова ўдзельнічае ў выпуску серыяльнага выдання – навуковага зборніка «Магілёўшчына». Брэсцкая абласная бібліятэка выпусціла зборнік матэрыялаў Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (2010). Вынікі даследчай работы супрацоўнікаў Барысаўскай ЦРБ знайшлі адлюстраванне на старонках апублікаваных зборнікаў міжнародных «Каладзееўскіх чытанняў», у кнізе супрацоўніка цэнтра краязнаўства А. А. Балябіна «Борисов, Березина… Последняя надежда Наполеона» (2012), многіх дзясятках артыкулаў у мясцовым, рэспубліканскім і расійскім друку, у навукова-кансультацыйнай дапамозе археолагам, спецыялістам у галіне турызму, тэлебачання (пры падрыхтоўцы айчынных і расійска-беларускіх тэлевізійных праектаў, прысвечаных вайне 1812 г. на Барысаўшчыне). Роля бібліятэк у публікацыях навуковых вынікаў па краязнаўстве сведчыць аб прызнанні іх статусу ў навуковай інфраструктуры краязнаўства разам з краязнаўчымі музеямі і ўніверсітэтамі краіны.

На нашу думку, пошукава-даследчая дзейнасць па краязнаўстве патрабуе як распрацоўкі перспектыўных комплексных рэгіянальных праграм, так і адлюстравання іх у перспектыўных комплексных праграмах навуковых даследаванняў па бібліятэчнай справе ў краіне [4]. Гэта дазволіць вызначыць мэты, тэматыку, формы даследаванняў на доўгатэрміновую перспектыву, пашырыць склад удзельнікаў, абгрунтаваць формы падачы іх вынікаў і шляхі распаўсюджвання новых краязнаўчых ведаў у рэгіянальнай і сусветнай інфармацыйнай прасторы. Вынікі даследаванняў абласных бібліятэк могуць быць падставай хадайніцтва аб наданні ім статусу навуковых цэнтраў з адпаведнымі пасадамі ў структурных падраздзяленнях краязнаўства.

Навуковы ўклад бібліятэк у фарміраванне фундаментальнай інфармацыйна-рэсурснай базы рэгіёназнаўства, абгрунтаванне новых краязнаўчых ведаў, выпраўленне памылак, скажэнняў, выяўленне новых фактаў дасягаюцца бібліятэкарамі-даследчыкамі з дапамогай вывучэння фіксаваных

крыніц інфармацыі. Гэта адкрывае перспектывы для папулярызацыі гуманістычных каштоўнасцей сярод мясцовага насельніцтва, асабліва моладзі, дапамагае не губляць культурных сувязей са сваёй малой радзімай ці зямлёй продкаў людзям, якія жывуць у іншых месцах, чаму спрыяюць віртуальныя краязнаўчыя праекты бібліятэк. Розныя кірункі і формы навуковай творчасці бібліятэкараў-краязнаўцаў дапамагаюць бібліятэкам уносіць важкі ўклад у справу захавання гісторыка-культурнай памяці грамадства.

---


1. Библиотеки и научное сообщество: взаимодействие и взаимовлияние : Междунар. науч. конф. «Румянцевские чтения – 2011» : [выступление Л. Н. Тихоновой] // Библиотековедение. – 2011. – № 5. – С. 19–23.

2. Борисовская центральная районная библиотека им. И. Х. Колодеева [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://borlib.by/. – Дата доступа: 12.11.2013.

3. Дзержинская центральная районная библиотека [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://dzerlib.by/pages/kraevedenie/activities.html. – Дата доступа: 13.11.2013.

4. *Кірухіна, Л.* Перспектывы развіцця бібліятэк Рэспублікі Беларусь: да праекта праграмы «Развитие библиотечного дела Республики Беларусь на 2011–2015 гг.» / Л. Кірухіна // Бібліятэчны свет. – 2010. – № 2. – С. 11–13.

5. Положение о краеведческой деятельности Псковской областной универсальной библиотеки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.pskovlib.ru/info/kraeveddelo.php. – Дата доступа: 15.09.2013.

6. Руководство по краеведческой деятельности муниципальных публичных библиотек (централизованных библиотечных систем). [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rba.ru/content/about/doc/ruk_kraeved.php. – Дата доступа: 25.05.2013.

7. Руководство по краеведческой деятельности центральной библиотеки субъекта РФ (области, края) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.rba.ru/content/about/doc/ruk_kraeved.php. – Дата доступа: 25.05.2013.

8. *Стрыжонак, І. М.* Краязнаўчая функцыя бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута грамадства / І. М. Стрыжонак, В. І. Саітава // Культура. Наука. Творчество : материалы II Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 10–11 апр. 2008 г. / науч. ред. Е. Н. Дулова. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2008. – Вып. 2. – С. 681–686.

9. *Трэпет, Л.* Краязнаўства / Л. Трэпет // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1997. – Т. 4 : Кадэты – Лячшэня / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – С. 257–260.


*S. ZYGMANTOVICH, V. SAITAVA*

## SCIENTIFIC ACTIVITY ON STUDY OF LOCAL LORE AS THE EMBODIMENT OF LIBRARY CULTURAL MISSION

*Aspects of scientific and research activities of libraries on local studies at present days are considered, its forms and contents are disclosed, the*

*conclusion about the institutionalization of libraries as regional centers of scientific research in the field of local lore is made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 06.12.2013.